УДК 94(481).03

# КАСЦЁЛ, СХІЗМА І ВЯЛІКАЯ СВЯТАЯ

**Шымак Алена Казіміраўна**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

У артыкуле разглядаецца гісторыя Каталіцкага Касцёла ў перыяд Вялікай схізмы. Звяртаецца ўвага на прычыны, якія папярэднічалі падзелу. Адзначаецца асаблівая роля Кацярыны Сіенскай у працэссе вяртання авіньёнскіх папаў у Рым.

Йохан Хейзінга ў сваёй працы «Восень сярэднявечча» пісаў, што ўсялякі час пакідае пасля сябе значна больш слядоў сваіх пакут, чым свайго шчасця. Бедствы - вось з чаго робіцца гісторыя. І ўсё ж нейкая несвядомая перакананасць кажа нам, што шчаслівае жыццё, ціхамірная радасць і салодкі супакой, якія выпалі на долю адной эпохі, у выніку не занадта адрозніваюцца ад усяго таго, што адбываецца ў любы іншы час [4].

У XIV ст. краіны Еўропы перажывалі цяжкія часы: эпідэміі, неўраджайныя гады, войны. Для Касцёла таксама наступілі восеньскія дні і сумныя часы. Да пачатку XIII ст. ужо былі створаныя ўсе структуры, якія фарміруюць Касцёл. З 1054 па 1300 гг. – адбываўся «час рэфармацыі» (Грыгарыянскія рэформы), але не знізу, працэсам кіравалі папы.

У гэты час ўзнік канфлікт паміж свецкай уладай і папамі (спачатку паміж папам Баніфацыем VIII, Клімент V і французкім каралём Філіпам Прыгожым). З гэтых супярэчнасцяў распачаўся т.зв. Авіньёнскі палон папаў (1309–1378). Рымскі папа пасяліўся ў бяспечным месцы – у Авіньёне, і такім чынам толькі паглыбіў залежнасць ад Францыі. У той час, калі пачалася вайна паміж Англіяй і Францыяй, з'явілася нават прыказка: «Папа – француз, а Езус Хрыстус – англічанін» [2]. Петрарка называў гэты перыяд «вавілонскім палонам». Пра Авіньён казалі як аб горадзе, які быў цалкам пазбаўленым духоўных рысаў.

70 год жыцця ў Авіньёне вельмі аслабілі Касцёл, а дакладней сказаць, – папства. Таму лагічным працягам гэтых падзей стаў перыяд Вялікай схізмы (1378–1417). Яшчэ ў 1059 г. паўстала практыка выбару папы кардыналамі. Пазней з'явілася ўдакладненне, што папа лічыцца абраным праз згоду 2/3 галасоў. На пачатку схізы справа заключалася ў тым, што паміж шаснаццаццю кардыналамі, якія павінны былі выбіраць папу, адзінства не было. Чатыры кардыналы былі італьянцамі, адзін іспанец, і аж адзінаццаць французаў [5]. У 1378 г. быў выбраны папа-італьянец Урбан VI. Французкія кардыналы палічылі, што ён нядольны да выканання сваіх функцый, таму пакінулі Рым. У Авіньёне яны абралі свайго папу Клімента VII. Парадокс сітуацыі быў у тым, што фактычна адны і тыя ж кардыналы абралі абодвух папаў. Пантыфікі, і рымскі, і авіньёнскі, сталі шукаць падтрымкі па ўсёй Еўропе, абодва назначалі кардыналаў і адлучалі ад Касцёла сваіх праціўнікаў.

Уявім сабе, што за «спектакль» адбываўся ў свеце аж да 1417 г. ?! У дадатак да гэтага, не забываемся, што ішла Стогадовая вайна (1337–1453 гг.). І вось, на фоне гэтага бруду, скандалаў, канфліктаў, а таксама вайны, дзе гінула нямала людзей, з'явілася фігура Кяцярыны Сіенскай. Гэта жанчына адыграла выключную ролю ў жыцці Касцёла. Яна нарадзілася ў 1347 г. у Сіене ў вельмі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вялікай сям'і, памерла ў Рыме ў 1380 г. Калі ёй было 16 гадоў, уступіла ў Трэці дамініканскі ордэн (для свецкіх асобаў). Яна жыла з сям'ёй сваіх бацькоў, але прыватна прытрымлівалася звычайных абяцанняў манаскага жыцця (чысціня, убоства і беднасць). Калі была яшчэ падлеткам, прысвяціла сябе малітве, справам міласэрнасці, асабліва даглядаючы хворых.

Сваім вобразам жыцця, пакорай Кацярына Сіенская заслужыла павагу і стала карыстацца вялікім аўтарытэтам. Да яе звярталіся за парадамі. Для менталітэту XIV ст. гэта была незвычайная сітуацыя – жанчына, фактычна свецкая, не мела тэалагічнай універсітэцкай адукацыі, але стала своеасаблівым духоўным лідарам. У пачатку 70-х гадоў XIV ст. да яе прыбыла спецыяльная камісія, у склад каторай уваходзілі і прадстаўнікі інквізіцыі, каб на месцы вырашыць прычыну незвычайнай папулярнасці Кацярыны. Але і яны не знайшлі ніякіх тэалагічных памылак у яе словах і справах.

Непасрэдным жаданнем Кацярыны было ўсталяваць мір у Касцёле. Але дзеля гэтага было неабходна вярнуць пантыфіка з Авіньёна ў Рым. Яна хацела, каб папа лічыўся вышэйшым духоўным аўтарытэтам у свеце, марыла пра адзінства ўсіх хрысціян, а таксама наднацыянальны і незалежны ад свецкай улады статус рымскага першасвятара. Кацярына рассылала па ўсім свеце доўгія пасланні папскім легатам, уладарам італьянскіх гарадоў і, вядома ж, «авіньёнскаму» папе Грыгорыю XI. У рэшце рэшт, паміж папам і Кацярынай наладзілася пастаянная перапіска. Кацярына аб'ехала шэраг гарадоў Італіі, куды яе запрашалі ў якасці аратара і міратворца. З'явілася яна і ў Авіньёне. Яе прыезду вельмі супраціўляліся французкія кардыналы, але гэта не перашкодзіла правесці перамовы з папам. Пасля іх сустрэчы сёмы па ліку авіньёнскі папа Грыгорый XI згадзіўся вярнуцца ў Рым [1, с.7–30]. З Авіньёна ён выехаў ў верасні 1376 г., а прыбыў у Вечны Горад у студзені 1377 г. Авіньёнскі палон скончыўся, але распачалася Вялікая схізма. Кандыдатура Урбана VI, якога абралі ў Рыме, незадавальняла многіх. Новы папа валодаў складаным характарам, уменне дыпламатычна вырашаць спрэчныя пытанні не было яго рысай. Французкая партыя ўвогуле была незадаволеная папам-італьянцам. Таму адбыўся яшчэ адзін канклаў – у тым жа, фактычна, складзе, але ў Авіньёне.

У гэтай сітуацыі звяртае на сябе ўвагу пастава Кацяры Сіенскай. Яна безапеляцыйна падтрымала папу Урбана VI, нягледзячы на яго недахопы. Вывучэнне захаваных дакументаў дазваляе месяц за месяцам прасачыць дзейнасць, якую развіла Кацярына ў абарону папы. Яна пісала лісты і пасланні амаль усім кіраўнікам дзяржаў Еўропы. Давала парады папу, як абнавіць склад Курыі. Спрабавала згуртаваць вакол папы тых, каго яна называла «супольнасцю добрых». У сваёй буле ад 13 снежня 1378 г. Урбан VI вырашыўся прасіць аб духоўнай дапамозе ўсіх вернікаў, і сама Кацярына разаслала булу са сваім суправаджальным лістом усім асобам, якія валодалі духоўным аўтарытэтам, якіх яна ведала, просячы іх выступіць адкрыта адзіным фронтам у абарону Урбана VI [1, с.31–48,  52–126]. Кацярына Сіенская памера ў 1380 г., не дачакаўшыся сканчэння схізмы. Яе біёграфы сведчаць, што апошнія месяцы жыцця яна штодзённа малілася аб супакоі і еднасці ў Касцёле. Гэтая простая жанчына імкнулася паказаць, што адзінства Касцёла не можа грунтавацца па-за асобай папы рымскага. «І Я кажу табе, што ты — Пётр, скала, і на гэтай скале Я пабудую



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Касцёл Мой, і брамы пякельныя не перамогуць яго. Я дам табе ключы Валадарства Нябеснага, і што звяжаш на зямлі, тое будзе звязана ў небе, а што развяжаш на зямлі, тое будзе развязана ў небе» (Мц 16, 18-19) [3].

У 1461 г. Кацярына Сіенская была абвешчана святой. У 1970 г. папа Павел VI абвясціў святую Кацярыну Сіенскую Доктарам Касцёла. Такім чынам, яна стала адной з нямногіх у гісторыі жанчын, хто мае такі ганаравы тытул.

## Літаратура


1. Екатерина Сиенская. Письма / Изд. подг. А. В. Топорова. – М.: Ладомир: Наука. – 2013. – 520 с.
2. Калмыкова, Е. В. Образы войны в исторических представлениях англичан позднего Средневековья / Е. В. Калмыкова – Москва : Квадрига, 2010. – 661 с.
3. Святая Екатерина Сиенская // Сикари А. Портреты святых. Электронный ресурс. – Режим доступа: https://www.truechristianity.info/library/portrety_svyatykh/portrety_svyatykh_11.php. – Дата доступа: 28.03.2025.
4. Хёйзинга, Й. Осень Средневековья: исследование форм жизненного уклада и форм мышления в XIV и XV веках во Франции и Нидерландах /Йоханн Хёйзинга. – Москва: Айрис-пресс, 2004. – 537 с.
5. Banaszak, M. Historia Koscioła katolickiego / M. Banaszak. Электронный ресурс. – Режим доступа: https://mbkm.pl/archiwum/Historia_kosciola/historiakk_t2.pdf. – Дата доступа: 20.02.2025.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова